**Беларускі дзяржаўны універсітэт**
**Гістарычны факультэт**
**пры падтрымцы міжнароднага праекта GCRF COMPASS**

Гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта запрашае прыняць удзел у міжнароднай навуковай канферэнцыі **«Рыжскі мірны дагавор 1921 г. у лёсах народаў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы»**, прысвечанай 100-гадоваму юбілею заключэння дагавора.

У 2021 г. спаўняецца 100 гадоў заключэння аднаго з найбольш важных міжнародных дагавораў XX ст. – Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. Гэты дагавор не толькі стаў завяршэннем ваеннага канфлікту паміж РСФСР і Польскай Рэспублікай, але таксама вызначыў межы краін ва ўсходняй частцы Еўропы амаль на два дзесяцігоддзі, зафіксаваў расклад сіл супрацьборствуючых бакоў, заклаў новыя супярэчнасці ў міжнародных адносінах і адыграў важную ролю у лёсах усіх народаў Усходняй і часткова Цэнтральнай Еўропы. Гістарычныя пытанні, звязаныя з Рыжскім мірным дагаворам, вельмі разнастайныя і ахопліваюць перыяд ад Першай сусветнай вайны, да пачатку Другой сусветнай на геаграфічным абшары Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Запрашаем да ўдзелу у канферэнцыі спецыялістаў па розных аспектах гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы канца XIX -- першай паловы XX ст.

**Навуковыя напрамкі работы канферэнцыі:**

- Рыжскі мірны дагавор 1921 г.: прычыны і наступствы падпісання;
- Рыжскі мірны дагавор 1921 г. і еўрапейская дыпламатыя;
- беларускае пытанне на савецка-польскіх мірных перамовах;
- войны, рэвалюцыі і сацыяльныя канфлікты на тэрыторыі Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропы ў канцы XIX – першай палове XX ст.;
- фарміраванне нацый і нацыянальных дзяржаў на тэрыторыі Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропы ў канцы XIX – першай палове XX ст.;
- сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ва Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропе ў канцы XIX – першай палове XX ст.;
- этна-канфесійныя працэсы на тэрыторыі Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропы ў канцы XIX – першай палове XX ст.;
- сучасныя тэндэнцыі і навацыі вывучэння гісторыі краін Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропы ў канцы XIX – першай палове XX ст.;
- ліквідацыя Рыжскага дагавора ў пачатку Другой сусветнай вайны.

**Месца правядзення канферэнцыі:** Мінск, гістарычны факультэт БДУ (вул. Чырвонаармейская 6)

**Час правядзення канферэнцыі:** 26 сакавіка 2021 г. 10.00

**Рабочыя мовы канферэнцыі:** беларуская, руская, англійская

**Для ўдзелу ў канферэнцыі** неабходна да **18 сакавіка 2021** года даслаць на электронную скрыню арганізацыйнага камітэта modernhistbel@gmail.com тэкст дакладу і заяўку ўдзельніка. У заяўцы абавязкова павінны быць указаны прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам), вучоная ступень, вучонае званне, назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык (афіліяцыя), пасада, кантактны тэлефон, адрас электроннай пошты і тэма паведамлення. Праграмны камітэт пакідае за сабой права адбору заявак для ўдзелу ў канферэнцыі і дакладаў для публікацыі. Праезд, пражыванне і харчаванне ўдзельнікаў канферэнцыі за кошт камандзіруючай арганізацыі. У залежнасці ад эпідэміялагічнай абстаноўкі праграмны камітэт пакідае за сабой права правядзення канферэнцыі ў фармаце “online”. Па выніках канферэнцыі плануецца выданне зборніка. Тэксты паведамленняў для зборніка неабходна прыслаць на адрас modernhistbel@gmail.com да 15 красавіка 2021 г. Патрабаванні да афармлення дакладаў для друку:

**Патрабаванні да афармлення матэрыялаў канферэнцыі:**

Пры падрыхтоўцы матэрыялаў неабходна кіравацца прыведзенымі ніжэй патрабаваннямі. Тэксты, афармленыя не ў адпаведнасці з патрабаваннямі, не прымаюцца да публікацыі.

**Агульныя патрабаванні:**

Матэрыялы прадстаўляюцца ў электронным выглядзе ў фармаце .doc или .docx Файл з матэрыялам павінен быць названы па прозвішчы аўтара, калі аўтараў некалькі - па прозвішчы першага аўтара. Малюнкі і табліцы неабходна ўстаўляць у тэкст пасля адпаведных спасылак на іх, а таксама прадубляваць асобнымі файламі ў фармаце .jpg / .cdr / .tiff / .eps / .xls. Памеры палёў: верхняе і ніжняе - па 20 мм, левае - 30 мм, правае - 20 мм. Шрыфт -Times New Roman, міжрадковы інтэрвал - 14 пт, без пераносаў. Усе старонкі павінны быць пранумараваны. Дапускаюцца такія прыёмы тэхнічнага афармлення як сістэма вылучэнняў (паўтлусты, курсіў).

**Тытульная старонка**
Тытульная старонка павінна ўключаць наступныя структурныя элементы:

**1.УДК** (нумар тэматычнай рубрыкі)

*Параметры:* памер шрыфта - 10 кг, напісанне - светлае, Курсіўны, выраўноўванне - па левым краі, без абзаца, інтэрвал пасля - 16 пт.

**2. Назва артыкула**

*Параметры: памер шрыфта - 11 кг, напісанне - паўтлустае, прамое, усе літары прапісныя, выраўноўванне - па цэнтры, без абзаца, інтэрвал пасля - 18 пт.*

**3. Ініцыялы і прозвішча аўтара(аў)**

*Параметры: памер шрыфта - 11 кг, напісанне - паўтлустае, курсіўнае, выраўноўванне - па цэнтры, без абзаца, інтэрвал пасля - 10 пт.*

**4. Афіліяцыя**

*Параметры: памер шрыфта - 10 кг, напісанне - светлае, Курсіўны, выраўноўванне - па цэнтры, без абзаца, інтэрвал пасля - 20 пт.*

**5. Анатацыя**

*Параметры:* памер шрыфта - 10 кг, начертание- светлае, прамое, выравнивание- па шырыні, Абзацны водступ - 10 мм, інтэрвал пасля - 12 пт.

**6. Ключавыя словы**

*Параметры: памер шрыфта - 10 кг; напісанне для словазлучэння «ключавыя словы: / keywords:» - паўтлустае, Курсіўны, для ключавых слоў - светлае, прамое; выраўноўванне - па шырыні; Абзацны водступ - 10 мм; інтэрвал пасля - 12 пт.*

**Увага! Узор афармлення беларускага альбо рускага блока (пункты 1-6):**

*УДК 543.257.*

**ОПРЕДЕЛЕНИЕ РИМАНТАДИНА В ЛЕКАРСТВЕННОМ ПРЕПАРАТЕ «ГРИППОМИКС» С ПОМОЩЬЮ ИОНОСЕЛЕКТИВНОГО ЭЛЕКТРОДАИ.**

***С.Иванов[1)], П.В.Петров[2)]***

*[1)] Научно-инженерное предприятие «Геоинформационные системы»,*
*ул. Сурганова, 6, 220012, г.Минск, Беларусь, ivanov@gmail.com*
*[2)] Белорусский государственный университет,*
*пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь, petrov@bsu.by*

Применен операторный подход к определению электрического и магнитного полей волн, распространяющихся врадиально-неоднородных цилиндрически симметричных бианизотропных средах. Для волн в плоскости сечения цилиндра возможно построить произвольное аналитическое решение уравнений Максвелла, если неоднородный материал бианизотропный или анизотропный, но не биизотропный или изотропный. Найдены решения ввиде цилиндрических волн Лежандра иопределены соответствующие им материальные параметры сред. Теория рассеяния обобщена на случай неоднородных цилиндрических частиц и применена к неоднородным объектам, в которых распространяются электромагнитные волны Лежандра.

***Ключевые слова:*** распространение электромагнитных волн; метаматериалы; рассеяние света.

**Увага!** Тэкст анатацый і інфармацыйнага блоку (пункты 1-6 афармляюцца ў трох версіях: беларускай, рускай і англійскай). Замежныя ўдзельнікі могуць не рабіць анатацыю на беларускай мове.

**Тэкст артыкула:**

**7. Размяшчаецца тэкст артыкула**

*Параметры: памер шрыфта - 12 кг, напісанне - светлае, прамое, выраўноўванне - па шырыні, абзацны водступ - 10 мм, міжрадковы інтэрвал - 12 пт.*

**8. Бібліяграфічныя спасылкі афармляюцца** ў адпаведнасці з ГОСТ СТБ 7.208-2008 «Бібліяграфічная спасылка». Скарачэнне слоў у бібліяграфічным запісе згодна ГОСТ 7.12-93 і 7.12-2001, скарачэнне замежных слоў (паводле ISO 4) - http://www.issn.org/services/online-services/access-to-the-ltwa/

Параметры: памер шрыфта - 11 кг, напісанне - светлае, прамое, выраўноўванне - па шырыні, Абзацны водступ - 10 мм, міжрадковы інтэрвал - 14 пт.

**Спіс крыніц** павінен быць размешчаны пасля тэкста артыкула, пранумараваны і аформлены наступным чынам:

*кнігі:* прозвішча і ініцыялы аўтара, поўная назва кнігі, месца выдання, выдавецтва, год выдання.

*Прыклад:* Балацкий Е. В. Элементы экономики государственного сектора. Минск : Капитал страны, 2013.

*артыкулы з часопісаў, зборнікаў, матэрыялаў канферэнцый і інш* .:

*Прыклад:* Дедов И. И., Шестакова М. В., Викулова О. К. Государственный регистр сахарного диабета в Российской Федерации: статус 2014 г. и перспективы развития // Сахарный диабет. 2015. Т. 18, No 3. С. 5–22. DOI: 10.14341/DM201535-22.

**Увага!** Афармляць спасылкі неабходна ў тэксце ў квадратных дужках на адпаведную пазіцыю бібліяграфічнага спісу з нумарам старонкі на якую спасылаецца аўтар. Нумараваны спіс крыніц і літаратуры прыводзіцца ў канцы артыкула. Выкарыстанне аўтаматычных пастаронкавых спасылак не дапускаецца.

**9. Да публікацыі прымаюцца** матэрыялы аб'ёмам да 15 тыс. знакаў

Зборнік матэрыялаў будзе выдадзены па выніках правядзення канферэнцыі. Адрас праграмнага камітэта: 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6, гістарычны факультэт БДУ, каб. 41. Тэлефон для даведак: (+375 17) 374 63 71; e-mail: modernhistbel@gmail.com